**Мэта:** стварыць умовы для паўтарэння і сістэматызацыі ведаў вучняў па асноўных пытаннях фанетыкі і арфаэпіі, графікі і арфаграфіі; удасканальваць ўменні пазнаваць моўныя з’явы, групаваць іх; папаўняць лексічны запас; развіваць звязнае маўленне ; садзейнічаць выхаванню ў вучняў цікавасці да нацыянальнай спадчыны, павагі да народных традыцый.

**Тып урока**: урок-падагульненне.

**Лексічная тэма**: Светлае свята Вялікдзень

**Абсталяванне**: вучэбны дапаможнік для 5 класа, карткі з падрыхтаванымі заданнямі, мультымедыйная прэзентацыя

**ХОД УРОКА**

1. Арганізацыйны момант.
2. Паведамленне тэмы і мэт урока.
3. Работа з матэрыялам урока.

1) Уступнае слова настаўніка .

8 красавіка праваслаўныя хрысціяне адзначаць светлае і любімае многімі свята – Вялікдзень. ВЯЛІКДЗЕНЬ (мясцовыя назвы -- Вялікадне, Вялічка, Пасха) – вялікае свята ў гонар сонца, вясны, абуджэння прыроды і надыходу земляробчага сезона. У эпоху хрысціянства Вялікдзень стаў прымяркоўвацца да ўваскрэсення ўскрыжаванага Хрыста.

*Паведамленне вучня*

У хрысціянскім календары Вялікдзень рухомае свята і штогод прыпадае на перыяд з 4 красавіка па 8 мая. Яно адзначаецца ў каталікоў у нядзелю пасля поўні, якая наступае следам за 21 сакавіка, ці дакладней, перыядам вясенняга раўнадзенства, а ў праваслаўных вернікаў пасля 21 сакавіка адлічваецца ўперад 13 дзён і таксама вызначаецца нядзеля пасля поўнага месяца.

Напярэдадні свята ў “чысты чацвер” старанна прыбіралі ў хаце, мыліся ў лазні. Зранку ў суботу завешвалі новыя фіранкі, набожнікі, замешвалі ў дзяжы цеста на пірагі і з абеда распальвалі ў печы, рыхтавалася святочная страва, абавязкова фарбаваліся яйкі ў цыбульным шалупенні .

**2) Актуалізацыя ведаў.**

**Заданне 1. Работа з тэкстам.**

Сімвалам Вялікадня з'я..ляецца пафарбаванае яйка, якое сімвалізуе жы..цё, перамогу жыц..я над смерцю.  Яго ч..рвоны колер нагадвае аб кр..ві Хрыста, пралітай д..еля выратаван..я люд..ей.
 Асвечаныя ў царкве яйкі елі першымі, калі пасля вяртан..я з усяночнай службы пачыналі святочнае засто..ле. У першы дзень Вялікадня лічылася неабходным мыц..а вадою, у якую было  пакладзена ч..рвонае велікоднае яйка, каб увесь год быць багатым, здаровым і прыгож..м.

v ***Вызначце стыль і тып маўлення****.*

*(Узор адказу.* ***Публіцыстычны стыль*** *( тэкст можа выкарыстоўвацца ў у газетах, часопісах, на тэлебачанні з мэтай расказаць людзям пра свята Вялікдзень;*
***тып тэксту***
*– апавяданне, бо расказвае пра падзеі, звязаныя са святкаванне Вялікадня)*

v ***Устаўце прапушчаныя літары і растлумачце іх правапіс***. Якая навука дапаможа нам у гэтай працы?

( **Арфаграфія** –раздзел навукі пра мову, у якім вывучаюцца правілы напісання слоў)

v ***Знайдзіце і выпішыце словы з першага сказа, у якіх колькасць літар і гукаў не супадае. Зрабіце фанетычны запіс слоў. Веды з якога раздзелу мовазнаўства вам дапамогуць у працы?)***

*( Узор адказу.* ***Фанетыка –****раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца гукі мовы.*

***Яйка*** *– 4л., 5 г. ;* ***якое –*** *4л., 6 г. 4* ***жыццё*** *– 5 л,4 г.,* ***з’яўляецца*** *– 9л, 10 г.,* ***пафарбаванае***
*-12л., 13 г.)*

v ***Назавіце адметныя фанетычныя рысы беларускай мовы.***

*(Узор адказу. Аканне, яканне, дзеканне, цеканне, у/ў, зацвярдзелыя гукі , прыстаўныя гукі.*

*Прыклады: жоўты –жаўцець; дні-дзень; жыта-у жыце;доўгі; шырокі; возера, аржаны)*

**Бліц – турнір**

v Колькі ў беларускай мове гукаў і літар? ( 32 літары, 49 гукаў)

v Назавіце галосныя гукі і літары ( 10 літар, 6 гукаў)

v Якія ёсць асаблівасці  галосных е. ё. ю. я, і ?

v Якія віды зычных гукаў вы ведаеце? ( глухія-звонкія, санорныя,  шыпячыя- свісцячыя, цвердыя –мяккія, зацвярдзелыя)

v Што вывучае графіка?  ( графіка вывучае суадносіны паміж гукамі і літарамі)

**Заданне 2. Фанетычны разбор слова “ясны”**

[Й’] – зычны мяккі, санорны

[А] – галосны націскны                                        Я

[С]- зычны цвёрды, глухі, свісцячы С

[Н] – зычны цвёрды, санорны Н

[Ы ]– галосны ненаціскны Ы

5 гукаў 4 літары

**Заданне 3. Па транскрыпцыі прачытайце і запішыце сказы.**

[па ўс’іх в’осках у п’эршыя два дн’і хадз’іл’і валачоб н’ік’і с’п’авал’і п’эс’ні ў й’ак’іх ўсхвал’ал’і гаспадароў па заканчэнн’і п’эс’н’і гаспадары надз’ал’ал’і валачобн’ікаў стравам’і са с’в’аточнага стала].

v ***Расстаўце патрэбныя знакі прыпынку і растлумачце правілы пастаноўкі.***

v ***Падкрэсліце граматычную аснову ў кожным сказе.***

v ***Знайдзіце і растлумачце арфаграмы.***

v ***У першым сказе знайдзіце слова, у якім усе зычныя мяккія.***

Узор адказу.

**Па ўсіх  вёсках у першыя два дні хадзілі валачобнікі,  спявалі песні, у якіх усхвалялі гаспадароў. Па заканчэнні *песні* гаспадары надзялялі валачобнікаў стравамі  са святочнага стала.**

v ***Зварот да тлумачальнага слоўніка беларускай мовы.***

**Валачобнік,** -а, мужчынскі род. Песеннік, які ходзіць у велікодныя дні па дварах з віншавальнымі песнямі.

*Паведамленне вучня*

У гурт уваходзілі музыкі, якія ігралі на скрыпцы і дудзе, а таксама чалавек, які насіў "валачобнае" — святочныя дарункі гурту. Валачобнікі абыходзілі ўсе хаты ў вёсцы і перад кожнай хатай спявалі, усхваляючы гаспадара, членаў яго сям'і, жадалі ім плённай працы, добрага ўраджаю, прыплоду жывёлы. У адказ гаспадары дзякавалі валачобнікам і давалі ім дарункі — "валачобнае" (фарбаваныя яйкі, каўбасы, сыр, булкі). Выкананне валачобнага абраду, як лічылася, спрыяе ўраджаю, дабрабыту сям'і, засцерагае ад розных нягод.

*ПЕСНЯ валачобнікаў (відэазапіс)*

ФІЗКУЛЬХВІЛІНКА

*Паведамленне вучня*

Вечарам з кожнай сям’і ішлі ў храм “на ўсенашную”. З сабой бралі па кавалачку кожнай стравы, якую па заканчэнню набажэнстваў свяшчэннікі асвяшчалі.

У гэту ноч імкнуліся не спаць. У хатах да ранку гарэла святло, запальвалі свечкі перад абразамі, маліліся.

Пасля “ўсенашнай” усе спяшаліся дадому. Гаспадыня накрывала святочны стол. Есці пачыналі з асвечанага яйка, солі і пірага, а затым смачна снедалі.

v ***Зварот да тлумачальнага слоўніка беларускай мовы.***

**Страва**,-ы, мн.-ы,страў,ж. 1.Пэўным чынам прыгатаваныя для яды прадукты харчавання, а таксама сама яда.2. Адзін з відаў яды, які падаецца на снеданне, абед і вячэру.

**Заданне 3.**

-Якія  беларускія нацыянальныя стравы, што гатуюць на Вялікдзень, вы ведаеце?(вучні называюць вядомыя ім стравы і запісваюць у сшыткі)

*Узор адказу.* **Кумпяк, каўбаса, налiснiкi, бульба, верашчака, яйкі, куліч.**

v **Пастаўіць у словах націскі. Даць азначэнне націску.**

**1гр. – падзяліць словы на склады. Даць азначэнне складу.**

**2 гр.- падзяліць словы для пераносу.**

**Склад –** ***гук або спалучэнне гукаў, якія вымаўляюцца адным штуршком паветра.***

**Націск** ***–вымаўленне аднаго са складоў слова з большай сілай голасу і працягласцю.***

v ***Параўнаць, ці ва ўсіх словах супадае падзел на склады з падзелам для пераносу.***

**Заданне 4. Перакласці на беларускую мову рэцэпт велікоднага куліча.**

v ***Зварот да тлумачальнага слоўніка беларускай мовы.***

**Куліч** , -а, мн. –ы, -оў, м.  Салодкі здобны пірог цыліндрычнай формы

**Ингредиенты**

Мука – 3 стакана

Молоко – 1 стакан

Яйца – 5 штук

Сахар -1 стакан

Сахарная пудра -0,5 стакана

Изюм -150 грамм

Дрожжи -35 грамм

Лимонный сок – 1 чайная ложка

Сливочное масло -200 грамм

Подсолнечное масло – 0,3 чайной ложки

v **Параўнаць правапіс у рускай і беларускай мовах.**

Інгрэд**ые**нты:

- Мука - 3-3,5 шклянкі
- Малако - 1 шклянка
- Яйкі - 5 шт
- Цукар - 1 шклянка
- Цукровая пудра - 0,5 шклянкі
- Разынкі - 150 грамаў (гук[ м] не падаўжаецца)
- Дрожджы - 35 грамаў ( [ дж ]– *адзін гук )*
- Лімонны сок - 1 чайная лыжка (*падваенне [н] , аглушэнне [ж])*
- Сметанковае масла - 200 грамаў *(е пішацца* у *2-гім  складзе перад націскам)*

- Алей - 0,3 чайнай лыжкі

1. **4. Падвядзенне вынікаў урока**
2. **5. Выстаўленне і каменціраванне адзнак.**
3. **6. Дамашняе заданне: запісаць ад мам і бабуль рэцэпт велікоднага куліча.**